«Мой родны кут…»

Пасютин Матвей
ГУО «Славенская средняя школа имени П.А.Галецкого Толочинского района»
6 класс

Нарадзіўся я ў вёсцы Славені. Гэта “мой родны кут”, мая радзіма. Тут мае карані. Тут нарадзілася мая маці. Тут бегалі басанож мая бабуля, прадзед і прабабка.

Мне здаецца, што памятаю нават свае першыя крокі на гэтай зямлі. Гэта невыпадкова: бабуля часта расказвае мне аб сваім дзяцінстве. Мне ўяўляецца, што гэта не яна, а я хаджу па пяшчаным дне празрыстай і рухавай рачулкі Славянкі, ловячы малькоў у прыгоршні, а сонейка грае вясёлымі плямамі на паверхні вады і адбіваецца зайчанятамі на жоўтым пяску і маіх босых нагах.

Рака ж наша была зусім не такая, як зараз. Яна была шырокая, з вялікай колькасцю глыбокіх віроў: Маркаў, Іванюлькаў, Паўлюкоў, Саўкаў, Рыгораў. Не перасыхала нават у самую вялікую спёку. Старажылы памятаюць той час, калі ў Славянцы вадзіліся ракі, ментузы, вялікія шчупакі, падобныя на старое бервяно. Зараз наша рака ператварылася ў невялічкі ручай, і к пачатку лета ад яе застаюцца толькі маленькія балотцы.

Ці здаецца, што бягу на досвітку па расістай траве за грыбамі к чыгунцы. Лесу тут паблізу не было, а па пасадцы раслі падасінавікі і баравікі сярод кустоў шыпшыны. Ці задоўга да таго, як сонейка ўстане, ганю кароў на выган, а потымназіраю, як займаецца зара, і слухаю, як спорна скубе траву статак. Смачна пазяхаю, перасмыкваючы плячыма ад ранішняга золку, і чакаю, калі заспявае жаўрук, ці закрычыць кнігаўка.

Гэтай восенню бабуля павяла нас з малодшым братам па мясцінах свайго дзяцінства па грыбы. Яна ішла і дзівілася, як ўсё змянілася. Дзе былі маленькія дубкі, зараз стаяць вялізныя дрэвы, у якіх ўгадваюцца будучыя волаты. Дзе былі невялікія кусты – зараз непралазны хмызняк. Бабуля не магла ніяк паверыць, што тут даўно не растуць не толькі баравікі, а і падасінавікі. І ўсё вяла нас далей і далей. Грыбоў мы так і не знайшлі, але ўбачылі магутны дуб з вялікім дуплом у выглядзе пячоры, ля якога бабуля са сваім таткам распальвалі вогнішча і грэліся позняй восенню, пасвячы кароў. Калі мы вярталіся, бабуля уздыхала, але ішла шпарка і не здавалася стомленай. Яна сумавала, але сум яе быў светлы. Дарогай мы назбіралі ягад глогу, духмяных, салодкіх. Брат падабраў незвычайныя галінкі, прыгожыя каменьчыкі, драўляныя трутавікі, з якіх мы потым зрабілі розныя падзелкі. Яны і зараз стаяць на журнальным століку, напамінаючы нашу вылазку.

Вось я ўсё пішу пра ўспаміны бабулі, як быццам у мяне няма сваіх любімых мясцін. Але ж асноўны пласт маўіх пачуццяў да роднай зямлі ад яе адданасці таму куточку, які дараваў ёй жыццё.

Усяго чатырнаццаць год я пражыў тут, але ведаю, што больш нідзе не разбудзіць мяне сонейка так, як дома, зазірнуўшы ў акенца з правага боку і

ласкава гладзячы маю шчаку. Больш нідзе так задзірыста не заціўкае верабейка, папіўшы першай веснавой вадзіцы з-пад страхі.

Нічым асаблівым не вылучаецца гэта зямля, але яна самая лепшая і прыгожая: гэта мая бацькаўшчына.

А ўспаміны, мае асабістыя, будуць. Яны з’яўляюцца з цягам часу: чым больш мінае вёснаў і зім, тым больш яркімі і дарагімі яны становяцца. Я гэта ведаю ад бабулі!